ПАДЗЕЯ

# МАСТАЦТВА – ЗЕМЛЯКАМ

**ВАЎКАВЫСКІ РАЁН. У Вярэйкаўскім доме культуры ў рамках агляду-конкурсу аматарскай творчасці прайшла канцэртная праграма пад назвай «Дарогі натхнення і творчасці». У свяце мастацтва прыняў удзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч.**



Віктар Георгіевіч на Ваўкавышчыне чалавек вядомы. Ветэран педагагічнай працы нягледзячы на гады стараецца захоўваць актыўную грамадзянскую пазіцыю, сур'ёзна захоплены не толькі паэтычнай творчасцю, але і з'яўляецца перакладчыкам паэзіі. Унёсак літаратара ў перакладчыцкую справу адзначаны на міжнародным узроўні арганізатарамі Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладу «Берега дружбы» (Растоўская вобласць, Расійская Федэрацыя). Віктар Георгіевіч працягвае ўдзельнічаць у праекце, у творах праслаўляе родны Ваўкавыскі край, сінявокую Беларусь, перакладае на беларускую мову паэзію расійскіх калег, узнагароджаны ў Расіі медалём «Настаўнік творчай моладзі». Самабытную творчасць беларускага паэта з задавальненнем перакладаюць на рускую мову літаратары з Расіі рознага ўзросту.

Можна сказаць, што ў адзін з красавіцкіх дзён «Дарогі натхнення і творчасці» (а менавіта пад такой назвай прайшла канцэртная праграма) прывялі паэта на сцэну Дома культуры аграгарадка Вярэйкі і падарылі выдатную магчымасць сустрэцца з аднавяскоўцамі, падзяліцца з імі сваім паэтычным словам. У рэпертуары агучаных твораў аўтар зрабіў акцэнт на грамадзянска-патрыятычнай тэматыцы. Тонкая душа паэта-земляка, патрыёта роднага краю здольная вобразна і змястоўна падкрэсліваць галоўнае ў нашым жыцці. Выказаныя ёмістa і вытанчана думкі паэта знайшлі водгук у сэрцах землякоў. І гэты факт таксама натхняе творцу.



**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч – удзельнік канцэртнай праграмы пад назвай «Дарогі натхнення і творчасці». Дом культуры аграгарадка Вярэйкі, Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць. Красавік 2024 года.





www.pisateli.by